Хоцімская бібліятэчная сетка

Трасцінская сельская бібліятэка

Серыя: Партрэт ветэрана



# Андрэй Іосіфавіч Анішчанка

Трасціна, 2013 г.

Хоцімская бібліятэчная сетка
Трасцінская сельская бібліятэка

# Андрэй Іосіфавіч Анішчанка

Нарадзіўся 20 мая 1924 года ў вёсцы Трасціно Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці.

На службу быў прызваны 2 кастрычніка 1943 года, пасля вызвалення Хоцімскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Неабстраляным юнаком быў кінуты ў крамешны ад – на Проню. А.І. Анішчанканка папаў у раён Прапойска (зараз Слаўгарад). У баі быў цяжка кантужаны. Затым быў шпіталь у в.Каменка Крычаўскага раёна і рэзервовы лыжны батальён.



К гэтаму часу ў вайне ўжо адбыўся пералом, савецкія войскі вёска за вёскай, горад за горадам вызвалялі ад фашысцкай нечысці. Стралок 1091-га стралковага палка А.І.Анішчанка ўдзельнічаў у вызваленні Магілёва, Мінска, Польшчы, дзе адзін з баёў стаў для яго апошнім у гэтай вайне. Дзень Перамогі Андрэй Іосіфавіч сустрэў у шпіталі ў польскім г. Бромберге. Быў узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны 2-й ступені, медалём “За адвагу”, юбілейнымі медалямі.

Праходзіў службу яшчэ да 1948 года.